## Літаратура

1. *Брускова, Н. В.* Категории ретроспекции и проспекции в художественном тексте: на материале немецкого языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Н. В. Брускова ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. – М., 1983. – 22 с.
2. *Гальперин, И. Р.* Ретроспекция и проспекция в тексте / И. Р. Гальперин // Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин ; отв. ред. Г. В. Степанов. – 9-е изд. – М., 2016. – С. 105–113.
3. *Тивьяева, И. В.* Ретроспективные сверхфразовые единства: формы и функции : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / И. В. Тивьяева. – Тула, 2007. – 175 с.
4. *Федорова, Л. Н.* Категория ретроспекции в художественном тексте: на материале английского языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Л. Н. Федорова ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. – М., 1982. – 21 с.


*Д. Я. Дрозд (Беларусь)*

# ВЕРБАЛЬНАЯ МАГІЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Прысутнасць магічных рытуалаў і дзействаў у вясельнай абраднасці абумоўлена неабходнасцю ўздзеяння на жыццёвыя сілы чагосьці звышнатуральнага, больш моцнага, чым практычная дзейнасць чалавека. Магічныя дзеянні надзвычай разнастайныя. Адны з іх уяўляюць сабою вельмі простыя рухі, жэсты, словы; другія характарызуюцца сінтэзам розных сродкаў і прыёмаў (пераапрацаванне, чытанне складаных слоўных формул, спецыфічныя дзеянні і атрыбутыка).

У аснове кожнага магічнага рытуала ляжыць непарыўная сувязь слова і дзеяння. А ў яго структуры можна выдзеліць тры ўзроўні: «думка – слова – дзеянне». Але ў ходзе абраду асобныя кампаненты трыяды могуць выпадаць або замяняцца сімвалічнымі адпаведнікамі. Абавязковым застаецца слова. Яно надзяляецца такімі ж якасцямі, як і суадносныя прадметы. Асабліваю сілаю надзяляліся пэўным чынам арганізаваныя слоўныя формулы-заклікані і больш складаныя сістэмы – замовы, песенныя творы з элементамі хрысціянскіх малітваў.

Элементы вербальнай магіі сустракаюцца на ўсіх этапах вяселля. Перад пачаткам кожнага абрадавага дзейства чыталіся малітвы, тэксты замоў, дзе ўпаміналіся імёны Госпада бога, Хрыста, Багародзіцы, многіх святых.

Сродкі магіі слова характэрныя для ўсіх відаў магічных дзеянняў, якія сустракаліся на вясельнай урачыстасці: любоўнай, ахоўнай, прадуцыруючай.

Прывядзем прыклад ахоўнай замовы:

«Отча наш… Як Хрыстос нарадзіўся, на Ярдані-рацэ хрысціўся, хрысціў неба і зямлю і сек ваду, – на ўвесь свет брызкі ляцелі. Як етых брызак нікому

не сабраць, і карэння ўсяго ў зямле ня парваць, і звёзд з неба ня пазнімаць, і камяня ня ўгрызнуць, і неба языком ня лізнуць, і зямлю ня пажраць – так раба божага ведзьмаку ня зьядаць!» [1, с. 53, № 83].

Магічны характар насілі заклёны-заклікі да прыродных стыхій, нябесных свяцілаў з просьбаю дапамагчы «скаваць вяселлейка слаўнае», знішчыць цёмныя сілы, даць новай сям'і добрую долю «год ад году вяселле, век ад веку здароўе»: «Хадзіла Марыська па сваім двару, / Прасіла месяца, ясную зару: / – Зорачка ясная, прасвяці да дня, / Пакуль жа збярэцца ўся мая радня» [2, с. 199, № 508].

Збіраючыся ехаць у сваты, сват і ўсе прысутныя ў хаце дзяўчыны хапалі начынне, што знаходзілася ў качарэжніку (вілкі, качэргі, венік), і закідвалі на печ, каб сватаўство ўдалося. Пры гэтым крычалі: «Закідвайце на грады, каб нам былі рады». Да печы за дапамогай звяртаўся сват, увайшоўшы ў хату дзяўчыны. Дакрануўшыся да печы (сакральнага месца ў хаце), ён ціхенька прасіў: «Печ, печ, дапамажы».

Захоўнай мэтай, каб заблытаць ліхія сілы, пазбавіць іх магчымасці паўплываць на ход сватання, размова свата і бацькоў дзяўчыны насіла іншасказальны характар.

Госці, напрыклад, казалі: «Мы паляўнічыя, гналіся за куніцай (вавёркай, лісіцай), бачылі, як яна забегла ў ваш двор». На гэта бацькі адказвалі: «Так, так, куніца забегла да нас, шукайце». Дыялог мог мець і іншы змест, дзе сваты гаварылі: «Мы купцы, ці няма ў вас добрага тавару? Мы багата заплацім, калі нам спадабаецца», – у адказ на што чулі: «Ёсць у нас тавар харошы, заходзьце ў хату паглядзець» [3, с. 225].

Калі сватанне было ўдалым, сват падымаў чарку гарэлкі і казаў: ««Дай жа Божа на век доўгі, на быт добры, каб здаровы былі, харашэ з сабою жылі і багаты былі, і нас не забылі, а Бога кахалі і бліжніх не забывалі». Гэта найбольш тыповы прыклад вербальнай магіі: слова пераўтвараецца ў энергію і праз Космас дапамагае дасягненню мэты» [3, с. 230].

Шырока бытаваў на тэрыторыі Беларусі абрад злучэння рук бацькамі маладых. Бацька нявесты складваў рукі маладых разам, прыгаворваючы: «Дай, Божа, у добры час, на вясёлае жыццё, на добрае здароўе, на доўгі век, на дзяцінае шчасце!». Сват і сваякі выгуквалі: «Дай, Божа!»

Апошнім перадвясельным абрадам быў дзявоцкі вечар – час развітання дзяўчыны са сваімі сяброўкамі. У гэты час рыхтавалі і вясельны вянок маладой, сукалі вясельныя свечкі, рабілі ўпрыгожванні для дружак. Перад кожнай справай прасілі благаславенне ў Бога і бацькоў: «Благаславі, Божа, і айцец і маці, свайму дзяцяці вянок завіваці» [3, с. 242].

Амаль паўсюдна на тэрыторыі Беларусі пачаткам вяселля лічыўся каравайны абрад. Выпечка абрадавага хлеба была справай вельмі важнай. Лічылі, што ад таго, як удаўся каравай, залежала будучае сямейнае жыццё маладой пары. На працягу абрадавага дзейства гучалі песні пра ўдзельнікаў вяселля з найлепшымі рысамі характару і знешняга выгляду, якія зарэкамендавалі сябе як добрыя гаспадары, бацькі. Матыў перабольшвання ў песнях павінен быў спрыяць багатаму і шчасліваму жыццю маладых: для каравая бяруць «сто пудоў

мукі пшанічнай, сто вядзёр вады крынічнай», дабаўляюць «тры капы яек, вядро мёду». Месяць цеста «ручкамі бяленькімі, перснямі залаценькімі», у печ саджаюць «багатыя ды пузатыя». Пячэцца каравай «у залатой печы з шаўковымі дымамі». За благаслаўленнем звярталіся да Бога: «Дай жа, Божа, каб каравай / Харошы ззыйшоў, / Каб доля Таццянкі / Была добра» [2, с. 63, № 46].

Матыў «падобнае нараджае падобнае» характэрны і для песень пасаднага абраду. У дадзеных творах бацькі маладых параўноўваюцца з сонейкам, месяцам, зоркамі. Дзяўчыну называюць княгіняю, баяркаю, царэўнаю. Адмыслова апісваюцца дарога да пасаднага месца і сам пасад: «А брат сястру вядзе, / Шаўком зямлю мяце, / Аўсом пасыпае, / Золатам палівае» [2, с. 481, № 1225]. «Дзе княгінька сядзіць, / Там луны ходзяць, / Ад золата сцены шчэпяцца, / Ад срэбра лаўкі ломяцца» [2, с. 512, № 1303].

Перад адпраўленнем да шлюбу маладыя прасілі благаслаўленне ва ўсіх прысутных. У адказ гучала: «Бог благаславіць!»

Найбольш эмацыйна насычаным было благаслаўленне бацькоў. З плачам і з галашэннямі дзяўчына кланялася бацькам, прыпадала да іх ног. Бацька благаслаўляў дачку: «Благаслаўляю цябе хлебам, соллю, шчасцем, доляй і добрым здароўем не на адну гадзіну, а на ўвесь доўгі век» [3, с. 262].

У песнях, якія гучалі падчас падрыхтоўкі да ад'езду на вянчанне, велічнасць маладых, іх адметнае становішча на вяселлі, а таксама пажаданне Божай дапамогі падкрэслівае прысутнасць святых на вянчанні: «Запрагай, татулька, варанцы, / Мы паедзем да вянцы. / Сам Бог вароты адчыніў, / Ангелы конікаў дзяржалі – / Так нашу нявесту вянчалі» [2, с. 555, № 1415].

Магічны характар мелі шматлікія пажаданні маладым, якія гучалі на вясельным застоллі, асабліва пры дзяленні каравая. Іх мэта – надзяліць новую сям'ю шчасцем, дабрабытам, здароўем: «Дарую пару галубоў, / Каб была моцная любоў. / Каб у вашым дамочку, / У вашым хлявочку, / У вашым садочку / Усё радзіла і пладзіла. / Дарую шчасце і долю / і стары куст, / Каб не быў двор пуст. / Каб друг друга цалавалі / і старога не пакідалі» [4, с. 24].

Выкарыстанне элементаў вербальнай магіі ў вясельнай абраднасці, яе спалучэнне з магіяй дзеяння павінны былі забяспечыць добры ход урачыстасці пры выкананні абраду ініцыяцыі маладой пары і надзяліць яе ў далейшым, ужо сямейным, жыцці ўсім самым найлепшым.

## Літаратура


1. Замовы ; уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.
2. Вяселле. Песні : у 6 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – Т. 2. – 680 с.
3. Беларусы : у 10 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 5 : Сям'я. – 374 с.
4. Вяселле: Абрад ; уклад., уступ. артыкул і камент. К. А. Цвіркі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.